Звычайна П. робяць камбінаванымі. Выкарыстанне П. значна павышае ккдз парасілавых установак.




**Параперагравальнік**: 1 — выхадны калектар для адводу перагрэтай пары; 2 — уваходны калектар для падводу насычанай пары; 3 — змеевікі.

**ПАРАПЕ́Т** (франц. parapet ад італьян. parapetto ад parare абараняць + petto грудзі), невысокая суцэльная сценка, якая агароджвае пакрыццё будынка, тэрасу, балкон, набярэжную, мост і інш. Часта бывае пастаментам для дэкар. ваз і статуй. Вядомы са старажытнасці ў архітэктуры Грэцыі і Рыма. Найб. шырока выкарыстоўваўся ў архітэктуры стыляў рэнесансу, барока і класіцызму. У выглядзе П. робяць парадныя агароджы участкаў сквераў і паркаў (П. вакол Цэнтральнага сквера ў Мінску, 1999).



**Парапеты** вакол Цэнтральнага сквера ў Мінску. 1999.

**ПАРАПЛАСТЫ**, гл. ў арт. *Газанапоўненыя пластыкі.*

**ПАРАПРАКТЫТ** (ад *пара... + практыт*), запаленне клятчаткі каля прамой кішкі і задняга праходу. Часцей выклікаецца гнаяроднымі мікробамі. Адрозніваюць **П.** востры і хранічны. Пры вострым утвараецца *абсцэс*, у цяжкіх выпадках — сепсіс. Прыкметы: востры боль у вобласці прамой кішкі, балючасць пры дэфекацыі, павышаная т-ра цела, з'яўленне інфільтрату ў вобласці задняга праходу, гнайнік можа прарвацца і ўтварыць *свішч*. Лячэнне: процізапаленчыя сродкі, хірургічнае.

**ПАРАПСАРЫЯ́З**, хранічнае захворванне *скуры* з папулёзнымі і эрытэматознымі высыпкамі. Бывае алергічнага, інфекц. паходжання, пры парушэнні абмену рэчываў. Адрозніваюць П. кроплепадобны, ліхеноідны, бляшачны. Лячэнне тэрапеўт., фізіятэрапеўт., вітаміны.

**ПАРАПСІХАЛОГІЯ** (ад *пара... + псіхалогія*), галіна псіхал. даследаванняў, якая вывучае формы пачуццёвасці, што забяспечваюць спосабы прыёму інфармацыі і якую нельга растлумачыць дзейнасцю вядомых органаў пачуццяў, таксама адпаведныя формы ўздзеяння адной жывой істоты на другую, на фіз. аб'екты, інш. нестандартныя здольнасці арганізма. Разам з паняццем «П.» ажываюць таксама паняцці «псіхатроніка», «біяінфармацыя», «біяінтраскапія» і інш. Вылучаюць тыпы форм пачуццёвасці: тэлепатыя — мысленныя зносіны паміж тымі, хто перадае і хто прымае (індуктар і рэцыпіент); яснабачанне — атрыманне ведаў пра аб'ектыўныя падзеі знешняга свету, не заснаванае на рабоце вядомых органаў пачуццяў і меркаваннях розуму; прадбачанне (праскапія) — прыватны выпадак яснабачання, які адносіцца да прадказання будучых падзей; лазашукальніцтва (біяфіз. эфект) — пошук з дапамогай індыкатара (сагнуты металічны дрот, лаза і інш.) падземных вод, руды, пустаты і інш.; парадыягностыка — пастаноўка заснаванага на яснабачанні мед. дыягназу без кантакту з хворым. Гэтыя формы пачуццёвасці часта аб'ядноўваюцца паняццем экстрасенсорнага ўспрымання. Яснабачанне, тэлепатыю і прадказанне адносяць да псі-феномена, а мысленнае ўздзеянне на аб'ект на адлегласці (псіхакінез, тэлекінез) — да псі-капафеномена.

Даследаванні феномена П. вядуцца з канца 19 ст., калі ў Лондане засн. «Таварыства для вывучэння псіхічных з'яў». Яно садзейнічала пазнанню псіхал. заканамернасцей гіпнозу, ідэаматорных актаў, субсенсорнага ўспрымання, фенаменальнай памяці, вылічальных здольнасцей. Многія з існуючых т-ваў і лабараторый аб'ядноўвае Міжнар. парапсіхалагічная асацыяцыя (Нью-Йорк). *В.В.Краснова.*

**ПАРАСІ́Й** (Parrasios) з Э ф е с а, старажытнагрэчаскі жывапісец 2-й пал. 5 ст. да н.э. Сын і вучань жывапісца Евенора. Працаваў у Афінах. У творах, якія вызначаліся пластычнасцю контурнай лініі, па-майстэрску перадаваў фіз. пакуты і ўнутр. перажыванні людзей: «Праметэй», «Філактэт», «Адысей сімулюе вар'яцтва», «Дэмас» (не захаваліся).

**ПАРАСІЛАВАЯ ЎСТАНО́ЎКА**, энергетычная ўстаноўка, якая звычайна складаецца з *паравых катлоў* і паравых рухавікоў, дзе энергія вадзяной пары пераўтвараецца ў мех. работу. У якасці паравых рухавікоў напачатку выкарыстоўвалі *паравыя машыны* (на паравозах, параходах і інш.), потым больш эканамічныя *паравыя турбіны.*

**ПАРАСІМПАТЫЧНАЯ НЕРВО́ВАЯ СІСТЭ́МА**, гл. ў арт. *Вегетатыўная нервовая сістэма.*

**ПАРАСІЦА**, рака ў Горацкім р-не Магілёўскай вобл., левы прыток р. Проня (бас. р. Дняпро). Даўж. 26 км. Пл. вадазбору 112 км². Пачынаецца на схілах Смаленскага ўзвышша за 1,5 км на ПнЗ ад в. Куртасы, вусце ў межах г. Горкі. Рэчышча на працягу 500 м каля вусця каналізаванае. На паўн. ускраіне г. Горкі плаціна і сажалка.

**ПАРАСО́НАВЫЯ**, с е л ь д э р э е в ы я (Umbelliferae, Apiaceae), сямейства двухдольных кветкавых раслін. Каля 300 родаў, больш за 3 тыс. відаў. Пашыраны ўсюды, найб. колькасць — ва ўмераных і субтрапічных зонах Паўн. паўшар'я. На Беларусі 33 роды, 51 від. У Чырв. кнігу занесена 6 відаў П.: астранцыя вялікая, баршчэўнік звычайны, бядрынец вялікі, дзікая пятрушка аленевая, сіела прамая, цгчыталіснік звычайны.

Адна- і шматгадовыя травы, радзей кусты або дрэўцы. Лісце звычайна простае, чаргаванае, моцна рассечанае. Кветкі дробныя ў складаных, часам простых, парасоніках ці галоўках. Плод — віслаплоднік. Ва ўсіх органах — эфіраалейныя ходы. Сярод П. шмат агароднінных (*кмен, морква, сельдэрэй, пастарнак, пятрушка*), тэхн. (*каляндра, ферула*), эфіраалейных (*аніс*, каляндра, *фенхель*), лек. (*амі*, кмен, ферула), дэкар. (*астранцыя, баршчэўнік*) раслін. Некат. моцна ядавітыя (*балігалоў, цыкута*), шэраг відаў (напр., *снітка, цьмянец*) пустазелле.

*Літ.*: Травянистые растения СССР. Т. 2. М., 1971; Жизнь растений. Т. 5 (ч. 2). М., 1981. *В.В.Маўрышчаў.*

**ПАРАСО́НІК** (Lepiota), род шапкавых базідыяльных грыбоў сям. шампіньёнавых. Каля 50 відаў. Пашыраны ўсюды, пераважна ў зонах з трапічным і субтрапічным кліматам. На Беларусі 7 відаў. Найб. вядомыя П.: востралускаваты (L. acutesquamosa), грабеньчаты (L. cristata), дробнашчытападобны (L. clypeolaria). Трапляюцца ў лясах, парках, сярод травы з чэрв. па кастрычнік.

Пладовае цела — шапка на ножцы дыям. 2—13 см, яйцападобная або званочкавая, потым распасцёртая, са шматлікімі лускавінкамі. Пласцінкі свабодныя, белыя. Ножка цыліндрычная, з нерухомым кольцам, выш. да 12 см. Споры бясколерныя, гладкія. Ядавітыя, ёсць ядомыя.